# ЗАСВАЕННЕ ПАНЯЦЦЯЎ «АДУШАЎЛЁНЫЯ» І «НЕАДУШАЎЛЁНЫЯ» НАЗОЎНІКІ ВУЧНЯМІ ІІІ КЛАСА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Чапля Таццяна Дзмітрыеўна*

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

Сучаснаму грамадству патрэбен адукаваны чалавек, які чалавеку нельга існаваць без адукацыі. Сёння школьная адукацыя мае праграму, у якой існуе вялікі шэраг розных прадметаў, дзякуючы чаму дзіця мае базавыя веды ў розных галінах навукі, але ж менавіта вывучэнне мовы адыгрывае значную ролю ў жыцці чалавека, бо праз слова людзі разумеюць адзін аднаго.

У школе з дапамогай вывучэння роднай мовы настаўнік фарміруе ў дзяцей цікавасць да гісторыі свайго народу, развівае камунікатыўныя якасці маўлення. У пачатковых жа класах вывучэнне больш накіравана на тое, каб дзеці маглі асэнсавана чытаць, размаўляць і пісаць.

Свабоднае і звязнае, а галоўнае, правільнае маўленне – гэта фактычна і ёсць мэта ўсяго курса беларускай мовы, таму настаўніку абавязкова трэба залажыць фундамент яшчэ ў пачатку навучання.

Ва ўмове беларуска-рускага двухмоўя цяжкасці ў засваенні пачатковых ведаў становяцца ўсё больш значнымі. На сённяшні дзень большасць беларускіх школ рускамоўныя, што бясспрэчна робіць уплыў на засваенне норм беларускай мовы. Так, напрыклад, адмоўна на выніковасць вывучэння беларускай мовы ўплываюць арфаэпічныя нормы рускай мовы.

Асаблівую ўвагу ў працэсе выкладання беларускай мовы неабходна звяртаць на асаблівасці розных часцін моў. Адной з ключавых часцін мовы з'яўляецца назоўнік, менавіта з гэтай часцінай мовы мы знаёмім дзяцей ужо ў другім класе.

У падручніку В.І.Свірыдзенкі для трэцяга класа адзначаецца, што «словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні хто? або што?, − гэта назоўнікі» [1, с. 48]. Але якія ж назоўнікі адказваюць на пытанне хто?, а якія – на пытанне што? У пачатковай школе гэта размежаванне выклікае ў дзяцей вялікую цяжкасць.

Свабоднае выкарыстанне назоўнікаў у моўнай плыні немагчыма без такіх паняццяў, як «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» прадметы. Таму мы ў сваім артыкуле вырашылі звярнуць увагу на дадзенае пытанне і разгледзець асаблівасці засваення паняццяў «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» назоўнікі вучнямі ІІІ класа.

Кожны настаўнік думае пра стратэгію сваёй працы на ўвесь вучэбны год. Гэта складае аснову яго поспеху ў далейшым. Але кожны настаўнік

ведае, што існуе спецыяльны план, выкананне якога патрабуе Міністэрства адукацыі. Так званае каляндарна-тэматычнае планаванне распрацоўваецца на базе адукацыйнага стандарта па канкрэтным прадмеце і вучэбнай праграме. У каляндарна-тэматычным планаванні размеркаваны ўвесь вучэбны матэрыял, адлюстраваны тэмы курса, яго ключавыя моманты і патрабаванні. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па прадметах складаюць, у асноўным, аўтары вучэбных дапаможнікаў, але нават у адных і тых жа аўтараў патрабаванні да ведаў тэм у праграмах і змястоўная магчымасць падручніка розныя.

Па тэме «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» назоўнікі ў КТП прапануецца настаўнікам наступнае: даць агульнае ўяўленне пра назоўнік як часціну мовы; вучыць адрозніваць назоўнікі, якія адказваюць на пытанне *хто?* і на пытанне *што?*; узбагачаць слоўнік навучэнцаў назоўнікамі-сінонімамі; развіваць мысленне, звязнае маўленне.

Падводзячы да гэтай тэмы, у вучэбным дапаможніку аўтар прапануе выканаць практыкаванне, у якім трэба дапоўніць сказы пэўнымі словамі – назоўнікамі. Пасля задаюцца пытанні: «Што абазначаюць гэтыя словы? На якія пытанні яны адказваюць?» [1, с. 47]. Вельмі важна, каб дзеці самастойна спрабавалі знайсці адказы на пытанні, гэта значна павысіць узровень засваення паняцця «назоўнік».

Затым у падручніку размешчана рубрыка «Успомніце», дзе вучням ІІІ класа прапануецца ўспомніць, якія назоўнікі адказваюць на пытанне хто?, а якія – на пытанне што? Усяго па дадзенай тэме аўтар прапануе два практыкаванні (практыкаванне 80 і 82) на размежаванне «адушаўлёных» і «неадушаўлёных» назоўнікаў. З тэарытычнага ж боку, у дапамогу настаўніку падаецца толькі азначэнне самога паняцця «назоўнік».

Пасля аналізу зместу падручніка і параўнання яго з патрабаваннямі праграмы і КТП, мы можам зрабіць вывад, што падручнік змяшчае ў сабе толькі невялікую частку з таго, што неабходна даць дзецям, таму настаўнік павінен не толькі растлумачыць вучням тэарэтычную частку, але і самастойна знайсці або распрацаваць практыкаванні для засваення паняццяў «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» назоўнікі.

У сучаснага настаўніка ёсць шмат спосабаў для вырашэння гэтага пытання. Але самым распаўсюджаным з іх з'яўляецца выкарыстанне рабочых сшыткаў на друкаванай аснове.

Друкаваны сшытак – гэта адзін з кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па канкрэтным прадмеце. Такі сшытак прапануе сваю мадэль вывучэння і засваення пэўных тэм. Практыкаванняў тут значна больш, чым у падручніку, што дазваляе дэталёва і больш паспяхова разгледзець матэрыял. Гэты спосаб, безумоўна, з'яўляецца самым простым: настаўніку не трэба шукаць дадатковую інфармацыю ці практыкаванні для

замацавання, таму што сшытак на друкаванай аснове ўжо ўяўляе сабой гатовы і распрацаваны матэрыял.

Другім падыходам да праблемы з’яўляецца пошук матэрыялу ў інтэрнеце. Гэта могуць быць як асобна ўзятыя практыкаванні, так і распрацаваны іншымі настаўнікамі матэрыял. Часта можна знайсці распрацаваныя канспекты ўрокаў.

Трэці, часта ўжывальны, падыход – выкарыстанне ўжо гатовых канспектаў урокаў. «Педагагічны» канспект – гэта падрабязны план, які адлюстроўвае змест ходу ўрока. План-канспект фіксуе не толькі ключавыя моманты, а змяшчае, таксама, дакладныя азначэнні паняццяў, практыкаванні, від, мэту, задачы заняткаў, сродкі навучання і г.д. Гатовыя канспекты ўрокаў дазваляюць не траціць шмат часу на падрыхтоўку і пошук матэрыялу, але пры ўмове, калі ён складзены на аснове падручніка.

Выкарыстанне актыўных метадаў навучання таксама з’яўляецца вельмі эфектыўным падыходам да вырашэння гэтага пытання. Ён ўяўляе сабой актыўнае ўзаемадзеянне настаўніка з вучнямі. Гэты метад можна рэалізоўваць адразу, каб уключыць вучняў у актыўную работу ўжо з самага пачатку заняткаў. Напрыклад, мы можам прапанаваць вучням верш ці які-небудзь мастацкі тэкст з адушаўлёнымі і неадушаўлёнымі назоўнікамі, якія на першым этапе працы можна выдзеліць колерам або падкрэсліць:

*Выйшла бабуля ў сад, села на ўслончык і пачала вязаць унуку Яшу рукавічку.*

*Раніца была цёплая, ласкавая, грэла сонейка, пад страхой пішчалі вераб'і, а ў траве бегаў коцік.*

*Апоўдні рукавічка была амаль гатова.*

*Вязала бабуля, вязала, ды, седзячы, і заснула.*

*Коцік убачыў клубок у траве, скокнуў да яго, торкнуў лапкай раз-другі, клубок і закаціўся ў кусты.*

*А там ляжаў Яша.*

*– Псік! – прагнаў ён коціка. Потым падняў клубок і пачаў наматваць на яго нітку.*

*Матаў, матаў, а ніткі няма канца. Бабуля прачнулася і пляснула ў далоні:*

*– А дзе ж рукавічка?!*

*А ад рукавічкі адзін пальчык застаўся.*

*Усю рукавічку Яша зноў на клубок пераматаў* (*Васіль Хомчанка*).

Далей ставім пытанні для разважання: «Што аб’ядноўвае выдзеленыя словы? І чым яны адрозніваюцца паміж сабой?». Калі дзеці ўжо ўключаны ў актыўны дыялог, прапануем размеркаваць дадзеныя словы на дзве групы. Далей зноў ставім пытанні: «Па якой прымеце вы размяркоўвалі словы?» Пасля выяўлення правільнага адказу разам з настаўнікам вучні робяць

вывад: назоўнікі, якія адказваюць на пытанні хто?, з’яўляюцца жывымі істотамі, а назоўнікі, якія адказываюць на патынні што?, абазначаюць нежывыя прадметы ці з’явы прыроды. Адразу пасля вываду настаўнік уводзіць паняцці «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» назоўнікі.

Замацаванне паняццяў з’яўляецца галоўнай мэтай заняткаў, таму большасць практыкаванняў павінны быць накіраваны на замацаванне паняццяў «адушаўлёныя» і «неадушаўлёныя» назоўнікі. Спачатку трэба пачынаць з найбольш простых практыкаванняў.

Напрыклад, прапануем вучням малюнак. Запрашаем знайсці і назваць назоўнікі: спачатку, якія з’яўляюцца адушаўлёнымі, а потым, якія з’яўляюцца неадушаўлёнымі.

Фізкультхвіліну таксама можна інтэрпрэтаваць у выглядзе практыкавання на замацаванне. Напрыклад, прапануем вучням наступнае заданне: кожны раз, калі настаўнік называе адушаўлёны назоўнік – вучні павінны тупаць, калі неадушаўлёны – пляскаць у далоні.

Акрамя традыцыйных практыкаванняў, можна прапанаваць вучням праверыць адзін аднаго. Гэта дазваляе сістэматызаваць і замацаваць веды.

Напрыканцы ўрока можна прапанаваць ужо больш складанае практыкаванне. Напрыклад, даць вучням самастойна прыдумаць сказы з ужываннем дадзеных паняццяў ці падабраць аднакарэнны неадушаўлёны назоўнік да адушаўлёнага.

Такім чынам, мы бачым, што часта зместу падручніка не дастаткова для эфектыўнага засваення і замацавання неабходнага матэрыяла. Таму настаўнік павінен выкарыстоўваць іншыя вучэбна-метадычныя сродкі або падбіраць ці распрацоўваць спецыяльныя практыкаванні.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – Ч. 2. – Мінск, 2017. – 148 с.